***Н. Я. Шалупенка*** *(Мінск),*
*аспірантка кафедры сацыялогіі і культуразнаўства*
*Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры*

# НАЦЫЯНАЛЬНЫЯ ТРАДЫЦЫІ І ВЫХАВАННЕ АСОБЫ

Значныя змены, якія адбываюцца ў наш час ва ўсіх сферах грамадскага жыцця, прад'яўляюць новыя патрабаванні да асобы. Сучасны чалавек павінен не толькі валодаць прагрэсіўнымі тэхналогіямі, але і ўсвядоміць сваю адказнасць за духоўнае развіццё грамадства, за лёс сваёй нацыі, яе будучыню. Менавіта таму адной з галоўных задач, якая стаіць сёння перад сістэмай адукацыі і выхавання, з'яўляецца фарміраванне творчай асобы, здольнай арганічна ўпісацца ў сусветную культуру і цывілізацыю.

Аднак размова аб агульначалавечых каштоўнасцях бессэнсоўная без сувязі з нацыянальнай культурай, з народнымі традыцыямі. Увайсці ў еўрапейскую і сусветную цывілізацыю наш народ зможа толькі праз уласныя духоўныя каштоўнасці, самабытную нацыянальную культуру. "Народная спадчына дае грунт для выхавання здольнасці чалавека асэнсоўваць сябе спачатку як прадстаўніка сям'і, роду, затым — народа, нацыі праз далучэнне да каштоўнасцей народнай культуры і гісторыі, пасля — як прадстаўніка мегаэтнасу (славянства) і нарэшце — бачыць сваё месца у сусветнай цывілізацыі"[1].

Культура — генетычная сістэма, якая ўзнаўляе сама сябе ў пакаленнях людзей. Як і кожная генетычная сістэма, яна павінна ўключаць у сябе структуру, якая перадае ад пакалення да пакалення культуру этнасу, як адзіна магчымае асяроддзе існавання. Гэта і ёсць адукацыя і выхаванне. Чалавек — істота грамадская. Таму важнейшым элементам чалавечай культуры з'яўляецца сістэма рэгулявання паводзін чалавека ў грамадстве. Яно ажыццяўляецца пры дапамозе маралі і права. У першабытным грамадстве і ў сялянскім асяроддзі аж да канца XIX стагоддзя спецыяльных інстытутаў выхавання і навучання не было. Іх ролю выконвалі звычаі і абрады, якія ўваходзяць у традыцыю. Інакш кажучы, традыцыя з'яўляецца тым генетычным механізмам культуры, які дазваляе ёй самаўзнаўляцца і забяспечвае саму рэалізацыю культуры.

Слова *традыцыя* паходзіць ад лацінскага traditio — *перадача*. Філасофскае вызначэнне паняцця "традыцыя" гучыць як "сукупнасць элементаў сацыяльнай і культурнай спадчыны, якія перадаюцца ад пакалення да пакалення і захоўваюцца ў пэўным грамадстве, класах і сацыяльных групах на працягу доўгіх часоў, ахопліваюць а'бекты сацыяльнай спадчыны (матэрыяльныя і духоўныя каштоўнасці), а таксама працэс і спосабы яе перадачы; у якасці традыцый выступаюць пэўныя грамадскія законы, нормы паводзін, каштоўнасці ідэі, звычаі, абрады"[2].

Традыцыі — грунтоўнае і агульнае паняцце аб маральным і духоўным жыцці чалавека, яны засвойваюцца і перадаюцца пэўнымі групамі людзей і выконваюць ролю трансфарматараў культурнага вопыту. У традыцыі выяўляюцца адносіны людзей паміж сабой і іх адносіны да прыроды.

Традыцыі ўключаюць у сябе адчуванне, мысленне, паводзіны і, акрамя таго, нормы, навыкі, звычаі, культурныя дасягненні, якія ўяўляюць сабой каштоўнасці для членаў этнасу, а таксама спосабы іх трансляцыі ад пакалення да пакалення.

Асобна трэба адзначыць, што новае пакаленне ніколі не атрымлівае ў спадчыну ўсе элементы мінулага, а толькі выбарачныя, папярэдне выпрабаваныя цэнаснай праверкай. Кожная традыцыя вызначаецца адносінамі да яе народа, або групы. Такім чы-

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

нам, галоўнае напаўненне традыцыі — гэта сам факт яе адбору, як асабліва каштоўнага, таго, што з-за гэтай каштоўнасці нельга дазволіць сабе страціць. Традыцыя выбіраецца і нават мадэліруецца ў адпаведнасці з самой гістарычнай сітуацыяй, прычым кожны этнас мадэліруе яе па-свойму, адбірае з традыцыі тое, што найбольш адпавядае патрабаванням часу і ментальнасці народа, або групы.

Нацыянальныя традыцыі — адметная частка культуры этнічнай супольнасці, нацыі. У іх замацавана тое, што аб'ядноўвае ўсіх людзей адной нацыі, кансалідуе сумесныя дзеянні. Яны непасрэдна звязаны з ладам жыцця народа, ландшафтам, сацыякультурнымі і гістарычнымі ўмовамі яго існавання, вераваннямі.

Нацыянальныя традыцыі, якія складваліся стагоддзямі, забяспечваюць духоўную пераемнасць паміж сучаснікамі, іх папярэднікамі і нашчадкамі, выступаюць гарантам пачуцця вечнасці, раўнавагі і бяспекі, неабходных чалавеку для нармальнага біяпсіхічнага развіцця і жыццядзейнасці.

Нацыянальныя традыцыі з'яўляюцца універсальным сродкам і спосабам выхавання. З глыбокай старажытнасці ў структуру беларускіх нацыянальных традыцый уваходзілі міфы, легенды, паданні, прыказкі, прымаўкі, звычаі, абрады, у якіх адлюстраваны лепшыя рысы беларускага характару. У духоўных традыцыях, у прыватнасці ў фальклоры, зашыфраваны, вызначаны першапачатковыя маральныя ўяўленні народа, яго духоўныя першасновы. Міф, да прыкладу, разглядаецца як вобразна-сімвалічнае вучэнне, што нясе ў сабе асновы светапогляду. Тое ж самае можна сказаць і пра народныя абрады беларусаў, якія раскрываюць асновы светапогляду, маралі, ладу жыцця, лепшыя ідэалы народа.

Вялікія выхаваўчыя магчымасці маюць звычаі. Праз звычай чалавек рэалізуе нормы паводзін у грамадстве, атрымлівае неабходныя веды і авалодвае пэўнымі навыкамі. Беларускія народныя звычаі садзейнічаюць фарміраванню і развіццю станоўчых рыс характару асобы, такіх як калектывізм, спагада, патрыятызм, талерантнасць і інш. Прыкладам можа служыць старадаўні народны звычай калектыўнай узаемадапамогі — талака, калі людзі ў выніку ўзнікшых абставін ішлі на дапамогу адзін аднаму, гуртам вырашалі сумесныя справы. Талаку наладжвалі ў розныя поры года, калі працаёмкая работа была не пад сілу аднаму гаспадару, або калі трэба было штосьці хутка зрабіць. Жніўная талака, напрыклад, мела за мэту своечасова зжаць жыта.

У беларускіх казках, прыказках, песнях праслаўляюцца сяброўства, праўдзівасць, працавітасць:"Праўда даражэй за грошы", "Працаваць не любіш — чалавекам не будзеш" і інш.

Такім чынам, можна адзначыць, што нацыянальная традыцыі адыгрываюць важную ролю ў фарміраванні асобы і яе сацыялізацыі, з'яўляюцца універсальным сродкам выхавання.

У XX стагоддзі адбыўся разрыў сацыяльнага і культурнага цыклаў, узнікла дысгармонія паміж людзьмі, грамадствам і прыродай. На сённяшні дзень гэта адна з важнейшых праблем усяго чалавецтва. І як вынік яе — дэфіцыт матэрыяльных і духоўных каштоўнасцей, страта ідэалаў.

Менавіта таму сёння, як ніколі, неабходны зварот да гістарычнага вопыту духоўнасці, да ідэалаў і маральных асноў, якія складваліся стагоддзямі. Наша задача — выкарыстоўваць багаты выхаваўчы патэнцыял нацыянальных традыцый.

---

[1] *Катовіч Н. К.* Асноўныя напрамкі выхаваўчай работы ва ўмовах адраджэння // Адукацыя і выхаванне. 1994. №10. С. 10.

[2] Традиция // Философский энциклопедический словарь. М., 1983. С. 692.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ